*Марыя Чайкоўская*

# ЕЎДАКІМ РАМАНАВІЧ РАМАНАЎ ЯК ДАСЛЕДЧЫК БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ МУЗЫЧНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ

Еўдакім Раманавіч Раманаў – беларускі этнограф і фалькларыст, археолаг, музеязнаўца, лінгвіст, педагог. Яго навуковая дзейнасць прыпадае на мяжу XIX-XX стст. Імя Е.Р. Раманава (1855-1922) у беларускай гуманітарнай навуцы можна паставіць у адзіны шэраг з імёнамі такіх вядомых даследчыкаў, як П.В. Шэйн (1826-1900), М.Я. Нікіфароўскі (1845-1910), М.А. Федароўскі (1853-1923) і Я.Ф. Карскі (1860-1931). Яго навуковая дзейнасць сёння не толькі не страчвае актуальнасці, насупраць – з'яўляецца прадметам даследаванняў этнографаў і фалькларыстаў XX ст., абуджае інтарэс музыколагаў.

Шматвектарнасць прафесійных пошукаў вучонага здзіўляе маштабнасцю і разнастайнасцю. У сферы ***этнаграфіі і фальклору*** за 50 год плённай працы ім было сабрана больш за 10000 фальклорных твораў: каля 3742 песень і 778 прыпевак; 2256 прыказак і прымавак; звыш 2300 загадак; 944 замовы; каля 825 казак, легенд і паданняў; 258 духоўных вершаў [1, с. 66-67].

Асноўная частка сабраных матэрыялаў увайшла ў шматтомнае выданне «Беларускі зборнік» - сапраўдную энцыклапедыю побыту, творчасці, жыцця, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа. Захаваліся і дайшлі да нас 9 тамоў «Беларускага зборніка», якія былі выдадзены пры жыцці Е.Р. Раманава (1886-1912). Узбагачаюць этнаграфічныя нарысы даследчыка выпускі «Магілёўскай даўніны» (1900-1903), «Матэрыялы па гістарычнай тапаграфіі Віцебскай губерні. Павет Вяліжскі», два выпускі «Матэрыялаў па этнаграфіі Гродзенскай губерні» (1911, 1912) і інш.

Е.Р. Раманаву належыць ганаровае месца ў гісторыі станаўлення ***беларускай археалогіі*** – з яго імем звязаны выдатныя адкрыцці ў гэтай сферы: Люцынскі могільнік Віцебскай губерні, помнік эпіграфікі XII ст. «Барысаў камень». Раманаў даследаваў археалагічныя помнікі Падняпроўя і Пасожжа, гарадзішча і Замкавую гару ў Магілёве, курганы ў Нова-Быхаве, Бруснсвічах, Лучыне Магілёўскай губерні. Раманаў з'яўляўся аўтарам каля 50 публікацый па беларускай археалогіі. Таксама ён пісаў пра манетныя скарбы, знойдзеныя на Магілёўшчыне, вёў антрапалагічныя даследаванні [2].

***Музейная дзейнасць*** вучонага была непарыўна звязана з рознымі сферамі яго працы. Так, яго этнаграфічныя і археалагічныя калекцыі ўзбагацілі многія айчынныя і замежныя музеі, заснавальнікам якіх ён з'яўляўся (Віцебскі, Магілёўскі, Віленскі музеі). Раманаў быў сапраўдным калекцыянерам прадметаў матэрыяльнай культуры беларусаў і археалагічных знаходак, а таксама актыўным удзельнікам этнаграфічных і археалагічных выстаў. Экспанаты, сабраныя навукоўцам, захоўваюцца ў Эрмітажы (1017 адзінак), Музеі антрапалогіі і этнаграфіі ім. Пятра Вялікага (больш за 2000), Рускім музеі (звыш 1100), Гісторыка-этнаграфічным музеі Акадэміі навук Літвы (242), якія даюць багацейшыя матэрыялы для вывучэння гісторыі Беларусі, Літвы і Латвіі [3, с. 3].

У галіне ***філалогіі*** Раманавым быў складзены «Вопыт беларускага слоўніка» як дапаўненне да слоўніка І. Насовіча «Кароткая беларуская граматыка», выпускі «Аб дыялектах Магілёўскай губерні і ўмоўных гаворках Беларусіі». Значнасць гэтых прац заключаецца ў тым, што даследчык адстойваў ідэю непаўторнасці і самастойнасці беларускай мовы, якая захавала найстаражытнейшы пласт агульнаславянскай і ўсходнеславянскай лексікі, а таксказ ідэю аб беларусах як самым «чыстым» славянскім народзе.

Між тым ёсць яшчэ адна галіна – ***этнаінструментазнаўства***, у якой Раманаў аставіў спадчыну. Ім напісаны спецыяльныя артыкулы *«Вымiраючы інструмент»* (1910), *«Гульні і забавы беларускіх дзяцей»* (1912) і *этнаграфічныя працы*, у якіх матэрыялы – тэксты песень і апісанні абрадавых дзействаў – утрымліваюць упамінанні пра розныя музычныя інструменты. І паколькі гэтыя матэрыялы дакладна дакументаваны, гэта дае магчымасць ўдакладніць тэрыторыі бытавання песень і абрадаў і, такім чынам, вызначыць месцы лакалізацыі музычных інструментаў.

Артыкул ***«Выміраючы інструмент»*** («Вымирающій инструментъ») [8] з'яўляецца выдатнай уласна этнаінструментазнаўчай працай. Напісаная ўслед за нарысам М.Я. Нікіфароўскага «Дудар і Музыка» [5], яна таксама прысвечана «рэдкаму архаічнаму інструменту» – беларускай дудзе [8, с. 123]. У артыкуле падрабязна разглядаюцца пытанні канструкцыі інструмента, тэхналогіі вырабу, спосабаў гуказдабыцця, функцыянавання. Вучоны прыводзіць выявы дуды з Дзісненскага павета[1] Віленскай губерні (мал. 1) і Люцынскага павета[2] Віцебскай губерні (мал. 2).

---

[1] Зараз г. Дзісна належыць да Міёрскага раёна Віцебскай вобласці.
[2] У цяперашні час гэтая тэрыторыя адносіцца да ўсходняга рэгёна Латвіі – Латгаліі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Малюнак 1* – Дуда з Дзісненскага павета



*Малюнак 2* – Дуда з Люцынскага павета

Як і Нікіфароўскі, Раманаў выдзяляе чатыры асноўныя часткі, з якіх складаецца дуда: скураны мех (1), драўляную соску (2), перабор (3) і гук (4) (мал. 3).




*Малюнак 3* – Асноўныя часткі, з якіх складаецца дуда



*Малюнак 4* – Трашчотка

Як бачна на ілюстрацыях, навукоўца прыводзіць два тыпу дуды: аднагукавую (мал. 1) і трохгукавую (мал. 2) як дуду больш позняга часу.

Як і Нікіфароўскі, ён звяртае ўвагу на складанасць «наладжвання дуды». Паколькі кожная мела свой лад, ігра дудароў у ансамблі была амаль немагчымай. Аднак у **VIII *вып. «Беларускага зборніка»*** сустракаецца апісанне вясельнага абраду ў Гарадоцкім павеце[3] Віцебскай губерні [7, с. 392–408]. На гэтым свяце першапачаткова закладзена ўмова прысутнасці двух дудароў – дудара жаніха і дудара нявесты. Калі жаніх прыязджае да нявесты, дудары сустракаюцца, і «дуды жаніха і нявесты кланяюцца адна адной і потым ужо пачынаюць іграць аднолькавую песню» [7, с. 399]. Абапіраючыся на гэтыя радкі, мы можам адзначыць выпадкі існавання ансамбля дудароў.

Даследчык падкрэслівае значную ролю дудара ў сялянскім жыцці: «…дуда складала неабходнае дабаўленне да рытуалу хрэсьбіннаму і свадзёбнаму, была неабходнай прыналежнасцю ўсіх вечарын, ігрышчаў, кірмашоў» [8, с. 127]. Згодна з матэрыяламі Раманава, дуда ў іерархіі інструментаў займала галоўнае месца, ёй уступалі першынства нават скрыпка і цымбалы. Пацверджаннем таму служаць словы Нікіфароўскага: «Што бы ні граў «дударъ», ён становіцца хазяінам вяселля» [5, с. 181]. Важнай персонай быў дудар і ў валачобным абрадзе, яму нават прысвячаліся строфы ў валачобных песнях. Цэннымі з'яўляюцца звесткі пра рэпертуар дудароў. На дудзе выконваліся песні – бяседныя, талочныя, жніўныя, а таксама танцы, як беларускія, так і іншыя. Сярод іх: «Мяцеліца», «Барыня», «Цярэшка», «Крутуха-Лявоніха», «Падушачка», «Кола» («Шастак»), «Таўкачыкі», «Казак рускі», «Казак жыдоўскі» («Іцка з Муськай»). Па словах Раманава, дудар «не жадаў іграць заносных «кадрелей», «полекъ», «леньтія» і т.п.» [8, с. 127].

Е.Р. Раманаў звяртаецца да вывучэння дзіцячых гукавых прылад і разглядае іх у артыкуле ***«Гульні і забавы беларускіх дзяцей»*** [7, с. 587-590]. Сярод інструментаў, якія ён апісвае, – жужалка і пішчэлка (свабодныя аэрафоны), свісцёлка і дудка (флейтавыя аэрафоны), труба (амбушурны аэрафон), трашчоткі (ідыяфоны).

[3] Зараз г. Гарадок – адміністратыўны цэнтр Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Пішчэлка* ўяўляе сабой полае гусінае пяро з падоўжаным надрэзам напрыканцы даўжынёю ў 2,5 см – атрымліваецца род язычка. Пры дзьмуцці атрымліваецца рэзкі гук. Іншы тып *пішчэлкі* з лістка травы-пласкушы закладваюць паміж вялікімі пальцамі і дзьмуць. Асновай *жужалкі* з'яўляецца костачка са зробленымі двума адтулінамі, праз якія прапускаюць два шнуркі. Калі пры раскручванні костачкі рэзка нацянуць паслабленыя шнуркі, атрымліваецца своеасаблівае жужжанне.

*Свісцёлка* можа мець выгляд глінянага канька, пеўніка і г.д., якіх звычайна купляюць на кірмашах. Варыянт *свісцёлкі* ў хатніх умовах робіцца вясной з лазовай кары ці з пустых стсвалоў бузіны. Больш удасканалены варыянт свісцёлкі ўжо становіцца дудкай-жалейкай. А пры тонкім ствале дрэва атрымліваецца «салавей». *Свісцёлку* можна зрабіць і з бляшанай крышкі, калі у яе цэнтральнай частцы прабіць адтуліну, а саму крышку сагнуць папалам, каб згіб прышоўся на адтуліну. Калі прыкласці такую свісцёлку да вуснаў і пачаць дзьмуць, яна выдае пранізлівы гук.

*Труба* вырабляецца са стрыжня ліста гарбузніка, у вярхушцы якога робяць невялікую вузкую шчыліну. Калі гэтую вярхушку ўзяць разам са шчылінай у рот, атрымліваецца даволі чысты трубны гук, тым мацнейшы, чым больш доўгі і таўсцейшы стрыжань ліста.

Даследчык вылучае па форме некалькі відаў *трашчотак*: першы – трашчотка ў выглядзе каробачкі (вырабляюць з лучыны), да якой прымацавана ручка і ў якую насыпаюць некалькі каменьчыкаў. Другі яе від – трашчотка ў выглядзе дошкі з прасунутай скрозь ручкай, якая крыху выдаецца па-над дошкай. Да ручкі паверх дошкі прывязваецца калатушка з плоскай дубовай пласціны. Калі такой трашчоткай пачаць размахваць, атрымліваецца «траскатня». Трэці від трашчоткі – самы любімы дзецьмі. Для яе вырабу бярэцца палка даўжынёю 17,8-26,7 см, канцы якой стачваюцца, а на тоўстай сярэдзіне выразаецца 6-8 глыбокіх рубцоў. Потым з лучынак робіцца трывалая лесвічка, якая прывязваецца да верхняга і ніжняга канцоў такім чынам, каб лучынкі прыкрывалі верхні з выразаных рубцоў. Калі пачаць круціць палку, лесвічка верціцца вакол лучынкі, саскокваючы з аднаго рубца на другі. Утвараецца аглушальны трэск.

У артыкуле ***«Дзіцячыя гульні беларускіх яўрэяў»*** («Детские игры белорусских евреев», 1891) [9] даследчык ўпамінае сярод дзіцячых цацак яўрэйскіх дзяцей гукавую прыладу *трашчоткі* (мал. 1), якая вядома нам як калотка (мал. 4).

Абодва артыкулы *«Выміраючы інструмент» і «Гульні і забавы беларускіх дзяцей»* ўносяць значны ўклад у беларускае музычнае інструментазнаўства. Апісанні вырабу, канструкцыі дуды і прыведзеныя Е.Р. Раманавым памеры частак інструмента з'яўляюцца вартымі для сучасных дудароў, якія ўзнаўляюць ігру на гэтым старажытным інструменце. Паколькі гэта адзіныя звесткі памераў дуды ў беларускай этнаінструментазнаўчай літаратуры, то сучасныя майстры рэканструіруюць інструмент менавіта па гэтых апісаннях. Нажаль, у артыкуле не прыводзіцца дакладных звестак пра настройку інструмента, але гэтыя недахопы кампенсіруюцца у нарысе Нікіфароўскага.

Раманаў паказаў, што ў дарослых і дзяцей розны інструментарый. У параўнанні са складанай канструкцыяй дуды, выраб дзіцячых інструментаў падаецца значна больш даступным. Пры іх складанні выкарыстоўваюцца галоўным чынам прыродныя матэрыялы, якія амаль не патрабуюць складанай апрацоўкі. Значным з'яўляецца класіфіцыраванне дзіцячага музычнага інструментарыя па канструкцыйным асаблівасцям.

Е.Р. Раманаў – першы з этнографаў-фалькларыстаў, які зразумеў сінкрэтычную сувязь фальклорных элементаў – слова і музыкі, і адчуў неабходнасць супрацоўніцтва этнографа з музыкантам. Першым буйным зборнікам музычнага беларускага фальклору з'явіўся ***VII выпуск «Беларускага зборніка»*** (1910) [6], у якім былі змешчаны 41 песня і 12 танцавальных прыпевак з нотамі. Выданне мелодый беларускага фальклору было даўняй марай даследчыка, і здзейсніць яе Раманаў змог толькі пасля сустрэчы з М.М. Чуркіным. Менавіта запісаныя кампазітарам мелодыі да сабраных Раманавым тэкстаў песень былі змешчаны ў «Беларускім зборніку». Гэта супрацоўніцтва абвясціла новы этап у беларускай музычнай фалькларыстыцы, напраўлены на разуменне моўных і музычных праяў фальклору як непарыўнага адзінства.

Навуковая дзейнасць Е.Р. Раманава аказала ўплыў на развіццё беларускай этнаграфіі і фарміраванне фалькларыстаў наступных пакаленняў. Яго супрацоўніцтва з М.М. Чуркіным абвесціла новы этап у станаўленні беларускага этнаінструментазнаўства і абудзіла інтарэс музыканта да фальклору і народнай песні.

У навуковай дзейнасці даследчык выкарыстоўваў самыя розныя крыніцы, якія ўтрымліваюць упамінанні пра музычныя інструменты. Яго калекцыя музычных інструментаў знаходзіцца ў Рускім музеі Санкт-Пецярбурга, а іх апісанні змяшчаюцца ў аддзеле рукапісаў Дзяржаўнага музея этнаграфіі народаў СССР пад назвай «Вопісы этнаграфічных калекцый Раманава з фотаздымкамі некаторых прадметаў. Музычныя інструменты. Беларусы, яўрэі, латышы» [4, с. 213]. На працягу сваёй дзейнасці даследчык арганізоўваў выставы, у якіх сярод прадметаў матэрыяльнай культуры беларусаў выстаўляліся розныя музычныя інструменты.

Артыкулы Е.Р. Раманава, прысвечаныя дзіцячым гукавым прыладам і беларускай дудзе, з'яўляюцца важнымі для сучасных даследчыкаў. Іх супастаўленне паказвае адрозненні музычнага інструментарыя дзяцей і дарослых: дзіцячыя інструменты выраблялiся пераважна з прыродных матэрыялаў і не патрабавалі значнай апрацоўкі, а выраб дуды з'яўляецца даволі складаным. У артыкуле «Выміраючы інструмент» даследчык пацвердзіў ужо напісанае Нікіфароўскім пра гэты інструмент, але апісанні Раманава змяшчаюць каштоўныя звесткі канструкцыі і памераў частак дуды, якімі сёння карыстаюцца сучасныя майстры пры ўзнаўленні гэтага старажытнага інструмента. Раманаў – адзін з першых, хто аддаў увагу музычным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інструментам пасля Нікіфароўскага.

Этнаграфічныя працы даследчыка сканцэнтравалі каштоўныя згадкі пра музычныя інструменты, што дае багаты матэрыял для яго асэнсавання і вывучэння. Сабраныя ім матэрыялы дазваляюць значна пашырыць і паглыбіць уяўленні аб складзе музычнага інструментарыя, які гістарычна бытаваў на Беларусі. Зварот да гэтых прац дазволіць атрымаць новыя звесткі ўжывання, распаўсюджання, выкарыстоўвання музычных інструментаў, а тым самым узбагаціць новымі ведамі беларускае этнаінструментазнаўства.

**Спіс літаратуры:**


1. Гілевіч, Н.С. З клопатам пра песні народа / Н.С. Гілевіч. – Мінск, 1970. – С. 66–76.
2. Каханоўскі, Г.А. Раманаў Еўдакім Раманавіч / Г.А. Каханоўскі // Энцыкл. гіст. Беларусі 6 [у 6 т.] – Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. – Т. 6, кн. 1. – С. 90.
3. Лярский, П.А. Слово о Евдокиме Романове / П.А. Лярский // Романовские чтения–4 : сб. тр. междунар. науч. конф. – Могилев, 2008. – С. 3–4.
4. Назина, И.Д. Становление и развитие белорусского этноинструментоведения как специальной научной дисциплины / И.Д. Назина // Белорусская этномузыкология : очерки истории XIX – XX вв. – Минск : Тэхналогія, 1997. – С. 199–233.
5. Никифоровский, Н.Я. Очерки Витебской Белоруссии. Дударь и музы́ка / Н.Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – М., 1892. – Кн. 13-14, № 2-3. – С. 170–202.
6. Романов, Е.Р. Белорусские народные мелодии. Песни сезонные, обрядовые, игровые, танцы, духовные стихи / Е.Р. Романов // Белорусский сборник : [в 9 т.] / Е.Р. Романов. – Вильна : Русский почин, 1910. – Вып. 7. – С. 44.
7. Романов, Е.Р. Быт белоруса. Словарь условных знаков / Е.Р. Романов // Белорусский сборник : [в 9 т.] / Е.Р. Романов. – Вильна, 1912. – Вып. 8. – С. 598.
8. Романов, Е.Р. Вымирающий инструмент / Е.Р. Романов // Виленский календарь. – 1910. – С. 123–128.
9. Романов, Е.Р. Детские игры белорусских евреев / Е.Р. Романов // Этнографическое обозрение. – М., 1891. – №2. – С. 133–141.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ